# ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІЯ НАВАЦЫІ
# Ў МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ X–XVII СТСТ.

***Л. У. Калядзінскі,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дактарант ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»*

У станаўленні матэрыяльнай культуры гарадоў Беларусі XII–XVII стст. можна вылучыць чатыры храналагічыя этапы.

Першы этап ахоплівае перыяд з X па XI стагоддзе. Гэта раннне гарадскі перыяд, звязаны з фарміраваннем адзінага дзяржаўнага ўсходнеславянскага ўтварэння пад назваю Русь, або, як гэта прынята ў гістарыяграфіі – Кіеўская Русь.

Другі этап ахоплівае XII–XIII стст., перыяд утварэння і існавання адасобленных удзельных княстваў, які ў савецкай гістарыяграфіі прынята было называць перыядам феадальнай раздробленасці.

Трэці этап пачынаецца з XIV ст. і працягваецца па XVI ст. Гэта перыяд Вялікага княства Літоўскага, у склад якого ўваходзілі і землі сучаснай Беларусі.

Чацверты этап ахоплівае перыяд XVI ст., калі землі Беларусі знаходзіліся ў складзе Рэчы Паспалітай.

Развіццё матэрыяльнай культуры гарадоў Беларусі адбывалася на грунце агульнарускай, усходнеславянскай культуры, якая сфарміравалася яшчэ ў часы Кіеўскай Русі і была агульнай для ўсіх гарадоў гэтага дзяржаўнага ўтварэння [8, с. 133–139]. Разам з тым, у станаўленні матэрыяльнай культуры гарадоў на працягу разглядаемага перыяду назіраліся і заходнеўрапейскія навацыі. У адрозненні ад прывазных рэчаў, якія траплялі на нашы землі шляхам гандлёвага абмену, многія катэгорыі рэчаў выраблялiся на месцы менавіта пад уплывам заходнеўрапейскіх традыцый, якія траплялі да нас разам з носьбітамі гэтых традыцый.

Для X–XI стст. у якасці такіх навацый можна адзначыць наяўнасць дэталяў вертыкальнага ткацкага станка – гліняных грузілаў, якія знойдзены пад час нашых раскопак на Верхнім замку Віцебска. Адно з такіх грузілаў (мал. 1) выраблена з мясцовай, шэрай гліны з дамешкам дробнага рачнога пяску і мае нераўнамерны абпал, які мог адбывацца, хутчэй за ўсё, на адкрытым вогнішчы.




*Малюнак 1. – Грузіла вертыкальнага ткацкага станка. X ст. Віцебск, Верхні замак*

Дыяметр гэтага грузіла 11,3 см. Вага яго 550 г. Дыяметр унутранага канала грузіла 2,3 см. На Ніжнім замку Віцебска ў час археалагічных раскопак іх сабрана паўтара дзесяткі [16, с. 34, мал. 52: 1; 2, с. 132, мал. 106]. У вялікай колькасці такія грузілы добра вядомы ў краінах Скандынавіі [15, с. 109]. Відавочна, што за сотні міляў гэтыя ўзоры побытовай, віталітыўнай, культуры сюды ніхто не прывозіў. Яны выраблялiся на месцы прадстаўнікамі тых краін, якія ў невялікай колькасці пэўны час пражывалі на тэрыторыі колішняга

Віцебска. Пэўная група рэчаў побытавага і крэатыўнага прызначэння (касцяныя вырабы з выявамі і надпісамі) сустрэты і на паселішчы гарадзішча Маскавічы, дзе таксама некаторы час пражывала насельніцтва скандынаўскага паходжання [6, с. 71–84, мал. 36].

Для XII–XIII стст. заходнееўрапейскія навацыі найперш праявіліся ў абарончай справе. Напрыклад, драўляныя унутрывальныя канструкцыі Віцебска і Мінска выкананы ў перакладной тэхніцы [9, с. 57–58; 7]. Падобная тэхніка ўзвядзення дрэва-земляных умацаванняў вядома была на землях Польшчы [4, с. 85–96]. У астатніх гарадах Беларусі ўнутрывальныя канструкцыі ў той час, як і ў абсалютнай большасці гарадоў Русі, рабіліся ў выглядзе клецяў. Сярод гарадоў Беларусі такая канструкцыя дакладна прасочана пад час раскопак Пінска [11, с. 80].

Пад заходнееўрапейскім уплывам ў некаторых гарадах Беларусі ў гэты час ўзводзяцца мураваныя вежы абарончага прызначэння – данжоны або вежы валынскага тыпу [13, с. 16–26]. Відаць пад іх уплывам аналагічныя па сваяму прызначэнню вежы пачалі ўзводзіць таксама з дрэва. У прыватнасці такая вежа тыпу данжон, сечаная з дрэва, добра вядома па раскопках Мсціслаўля [1, с. 231–241].

Пад уплывам заходнееўрапейскага домабудаўніцтва ў некаторых гарадах Беларусі, напрыклад, у Віцебску і Мінску з'яўляюцца пабудовы рамкава-каркаснай канструкцыі. У адрозненне ад пабудоў Заходняй Еўропы, дзе яны выкарыстоўваліся як жытлы, на тэрыторыі Беларусі ў XII–XIII стст. яны з'яўляліся выключна пабудовамі гаспадарчага прызначэння. Верагодна пад заходнеўрапейскім уплывам ўзніклі і некаторыя навацыі ў домабудаўніцтве Навагрудка, дзе раскопкамі ўскрыты дамы плошчаю да 100 кв. м, атынкаваныя, з фрэскавым роспісам і шклянымі шыбамі [5, с. 15–16]. У астатніх гарадах у гэты перыяд домабудаўніцтва прадстаўлена зрубнымі пабудовамі плошчаю 20–25 кв. м. Такая карціна была ўласціва абсалютнай большасці гарадоў Русі. У цэлым, побытовую культуру ў гэты перыяд заходнеўрапейскія навацыі не кранулі. У гарадах Беларусі яна была той жа, што і ў абсалютнай большасці гарадоў Русі.

У XIV–XVI стст. назіраецца паступовае, усё больш актыўнае пранікненне заходнеўрапейскіх навацый у матэрыяльную культуру гарадоў Беларусі. Найперш яно закранула абарончае дойлідства. Такія гарады як Навагрудак, Гродна і Віцебск (мал. 2) абносяцца мураванымі сценамі і вежамі [12, с. 14–35, 119–135], ва ўзвядзенні і рамонце якіх, напрыклад у Віцебску, бяруць ўдзел нямецкія майстры [3, док. 1, с. 25–26, 52–60].




*Малюнак 2. – Віцебск. XIV ст. Мастацкая рэканструкцыя Леаніда Калядзінскага і Ігара Дурава*

У гэты час пад уплывам заходнеўрапейскіх традыцый узнікае домабудаўніцтва, як гэта мела месца ў Навагрудку («дом феадала» – па Ф. Д. Гурэвіч) і на Верхнім замку Віцебска (палац кн. Альгерда).

У масавым драўляным домабудаўніцве мянецца канструкцыя печы. Пры ўзвядзенні печы, пад уплывам тых жа заходнееўрапескіх традыцый, ужываецца кафля: гаршковая (мал. 3), затым міскападобная і нарэшце пласцінчатая. Тыпы не строга паслядоўна змяняюць адзін аднога, а суіснуюць у канструкцыі печаў. Пласцінчатая кафля аздабляецца рознымі сюжэтамі, на ёй маюцца і геральдычныя сюжэты, што таксама з'яўляецца праяўленнем заходнеўрапейскага культурнага ўплыву [14, с. 129–150, мал. 74, 79, 81, 84, 85].

У побытовай культуры зяўляюцца нажы з клеймамі – сведкамі іх цэхавай вытворчасці. Інстытут цэхавага рамяства з'ява таксама заходнеўрапейскга паходжання.

На пачатку XIV ст. на тэрыторыю Беларусі пранікае готыка [10, с. 138–149], стыль, які ахоплівае пэўную частку віталітыўнай культуры. З'яўляецца абутак, што адлюстроўвае модныя еўрапейскія тэндэнцыі – чаравікі, з вострымі «гатычнымі» насамі. Аналаг такім чаравікам ёсць на землях Польшчы і Літвы XIV ст.

Кухонны посуд, а менавіта гаршкі, у XIV–XV стст. у вобласці плечука набываюць вострае гатычнае рабро.




*Малюнак 3. – Пячная гаршковая кафля. Кан. XIV – пач. XV ст. Гродна, Стары замак*

У XVII ст. заходнеўрапейскія навацыі ўжо ахопліваюць значную частку побытавай віталітыўнай культуры. Найперш гэта датычыцца кухоннага, сталовага і тарнага посуду. Яго разнастайнасць па прызначэнні і па формах абумоўлена цэхавай вытворчасцю, якая была разлічаны на значна шырэйшы рынак, чым ў мінулую эпоху.

Поруч з керамічным посудам ў гэты ж час набывае распаўсюджанне шкляны посуд, узоры якога добра вядомы ў краінах Заходняй Еўропы. У побыце эліты з'яўляецца новы элемент, прадстаўляючы культуру харчавання – двузубыя відэльцы. Гэтыя знаходкі маюць месца ў многіх гарадах Беларусі.

Пачынаючы з XVI ст. набывае распаўсюджванне будаўніцтва дамоў з рамкава-каркасных канструкцый. Напрыклад, у гарадах Гродна і Нясвіжы, што адлюстравана на гравюрах.

Такім чынам на працягу разглядаемага перыяду, з X ст. па XVII ст., у матэрыяльную культуру гарадоў Беларусі, паступова, дзе ў большай, а дзе ў меншай ступені пранінікалі заходнеўрапейскія навацыі. На першым этапе станаўлення матэрыяльнай куьтуры яны глыбока не ўкараняліся і не ахоплівалі ўсёй сферы віталітыўнай культуры. Найбольш інтэнсіўнае пранікненне і замацаванне навацый назіраецца на трэцім і чацвёртым этапах, калі гарады Беларусі знаходзіліся ў складзе дзяржаўнага ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, а затым і Рэчы Паспалітай. Аднак трэба адзначыць, што пры гэтым дамінуючую ролю ў фарміраванні штодзённай побытовай культуры займалі агульнарускія традыцыі, якія былі выпрацаваны яшчэ на першых двух этапах. У той жа час, наяўнасць заходнееўрапейскіх уплываў і элементаў у матэрыяльнай культуры надаваў нашым гарадам пэўную адметнасць у параўнні з гарадамі Рускай дзяржавы.

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС**

1. Алексеев, Л. В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: [в 2 кн.] / Рос. акад. наук, Ин-т археологии. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – 288 с.

2. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая пол. XIV в.) / Т. С. Бубенько ; Витеб. гос. ун-т им. П. М. Машерова. – Витебск: ВГУ, 2004. – 276 с.

3. Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі) / падрыхт. А. Дзярновіч ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Athenafum, 2005. – Вып. 1: Дакументы гаспадарча-гандлёвыя, XV–XVI стст. – 88 с.

4. Гензель, В. Археологические исследования и проблемы возникновения польского государства / В. Гензель // Совет. археология. – 1959. – № 2. – С. 85–96.

5. Гуревич, Ф. Д. Жилые и хозяйственные постройки городов Черной Руси / Ф.Д. Гуревич // Проблемы изучения древнего домостроительства в VIII–XIV вв. в Северо-западной части СССР: тез. докл. Межресп. симп. / АН СССР [и др.; редкол.: Э. С. Мугуревич (отв. ред.) и др.]. – Рига, «Зинатне», 1983. – С. 12–16.

6. Дучыц, Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў XI–XIV стст.: гіст.-археал. нарыс / Л. У. Дучыц ; Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі ; пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 118 с.

7. Заяц, Ю. А. Оборонительные сооружения Минска XI–XIII вв. / Ю. А. Заяц, Акад. наук БССР, Ин-т истории. Минск, 1996. – 79 с.

8. Калядзінскі, Л. У. Матэрыяльная культура гарадоў Беларусі ў X–XVII стст. (генезіс і станаўленне ) / Л. У. Калядзінскі // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии, Новгород, 26–31 авг. 1996 г. : [в 5 т.]. – М., 1997. – Т. 2 : Славянский средневековый город. – С. 133–139.

9. Калядзінскі, Л. У. Пра абарончы вал дзядзінца летапіснага Віцебска / Л. У. Калядзінскі // Заслаўскія чытанні 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў свеце агульнанацыянальных праблем», [Заслаўе], 9–11 ліст. 1995 г. / уклад. Т. С. Скрыпчанка; Гіст.-культур. запаведнік «Заслаўе». – Заслаўе, 1997. – С. 57–58.

10. Кушнеревич, А. Н. Готические изразцы Великого Княжества Литовского / А. Н. Кушнеревич // Архитектурно-археологический семинар «Из истории строительной керамики средневековой Восточной Европы»: материалы науч. заседания, Санкт-Петербург, 14–15 мая 2002 г. / Гос. Эрмитаж. – СПб., 2003. – С. 138–149.

11. Лысенко, П. Ф. Города Туровской земли / П. Ф. Лысенко ; Акад. наук БССР, Ин-т истории ; ред. В. В. Седов. – Минск : Наука и техника, 1974. – 200 с.

12. Ткачев, М. А. Замки Белоруссии / М. А. Ткачев. – Минск : Полымя, 1987. – 222 с.

13. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVII стст. / М. А. Ткачоў ; АН БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 142 с.

14. Трусов, О. А. Памятнки монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. : архит.-археол. анализ / О. А. Трусов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 159 с.

15. Штакельберг, Ю. И. Глиняные диски из Старой Ладоги / Ю. И. Штакельберг // Археологический сборник / Гос. Эрмитаж. – Л., 1962. – Вып. 4 : Славянские древности / [под ред. М. И. Артамонова]. – С. 109–115.

16. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов / Акад. наук БССР, Ин-т истории; науч. ред. В. П. Даркевич. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с.

### СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ

Малюнак. 1.– Грузіла вертыкальнага ткацкага станка. X ст. Віцебск, Верхні замак.

Малюнак. 2. – Віцебск. XIV ст. Мастацкая рэканструкцыя Леаніда Калядзінскага і Ігара Дурава.

Малюнак. 3. – Пячная гаршковая кафля. Кан. XIV – пач. XV ст. Гродна, Стары замак.

## ИДЕОЛОГИЧЕСКОЕ ПРОТИВОСТОЯНИЕ В УСЛОВИЯХ ГЕРМАНСКОЙ ОККУПАЦИИ (1941–1944 ГГ.)

***А. В. Касович,***
*кандидат исторических наук, доцент,*
*доцент кафедры истории Беларуси и славянских народов, БГПУ*

Политическое руководство СССР придавало огромное значение проведению агитационно-пропагандистской работы на оккупированной территории в годы Великой Отечественной войны. Необходимость её активного ведения диктовалась следующими причинами. Во-первых, задачей максимально ослабить